

Emmaus

Бюлетэнь рымска-каталіцкай парафіі

Маці Божай Бялыніцкай г. Горкі

№ 22-2014, 20.07.2014

PDF–архіў на сайце www.kasciol.by

**Роздум:**

# Як размаўляць з дзецьмі пра Бога? - заканчэнне

### *Як пазбегнуць злоўжывання рэлігіі ў выхаванні дзіцяці?*




Я б адказала словамі са Святога Пісання «як хочаце, каб з вамі абыходзіліся людзі, так абыходзьцеся і вы з імі». Паспрабуйце прыкласці спосабы духоўнага выхавання, якія вы ўжываеце ў дачыненні да дзіцяці, да якой-небудзь сферы вашага жыцця. Варта памятаць, што Бог не толькі справядлівы, але і міласэрны. Варта паказваць гэтую міласэрнасць і любоў дзецям.

### *Што павінны зрабіць бацькі, калі іх дзіця-падлетак прыйдзе і скажа, што ўжо не верыць у Бога?*

Хачу, напэўна, пачаць адказ ад супраціўнага: чаго не трэба рабіць у такой сітуацыі. А не трэба панікаваць, упадаць у роспач, а таксама накідвацца на падлетка з крыкамі «як ты можаш??!!», «дзе цябе выхоўвалі??!!» і г.д.  Трэба памятаць, што крызіс веры — гэта адзін з кампанентаў складанага падлеткавага перыяду. Дзіця мае пераасэнсаваць сябе, сваё жыццё і погляды, перайсці з дзяцінства

да даросласці. Гэта складаны шлях, на якім шмат нечаканасцяў, у тым ліку непрыемных. Але калі ў веры дзіцяці да таго часу быў закладзены моцны падмурак — яно вернецца да Бога.



А што трэба рабіць, дык гэта размаўляць (спакойна!) аб гэтай сітуацыі з дзіцём. Пацікавіцца, што здарылася. Можа, прычына для нявер'я — тое, што з яго кпяць у школе з-за таго, што ён ходзіць да касцёла. І тады справа не ў Богу, а ў адносінах з аднакласнікамі.

Калі ж сітуацыя настолькі сур'ёзная, што дзіця не толькі адмаўляецца ад веры, але і ўступае, напрыклад, у антыхрысціянскія суполкі ці секты — гэта можа, на жаль, казаць аб тым, што, па-першае, у яго ранейшым выхаванні былі дапушчаныя значныя памылкі, а па-другое, што цяпер праблемы ў яго вельмі вялікія. У любым выпадку, гэта не віна, але бяда падлетка. Зразумела, што такія складаныя сітуацыі лепш разглядаць індывідуальна.

***У чым, на вашу думку, асноўны прынцып духоўнага выхавання?***



Любоў. Гэта, на маю думку, падмурак любога выхавання. А таксама шчырасць: бацькі павінны самі прытрымлівацца прынцыпаў, якім вучаць сваё дзіця.

*Паводле: Наталля Станкевіч, Святлана Жылевіч, http://catholic.by*

**XVI Нядзеля Звычайнага Перыяду**

На гэтым тыдні расклад багаслужэнняў будзе наступны:

- у панядзелак, пятніцу - у 18.00
- з аўторка па чацвер - святой Імшы ў капліцы не будзе
- у суботу – у 10.00
- у нядзелю – святая Імша ў 16.00

у літургіі успамінаем:

- 22 ліпеня (аўторак) - успамін святой Марыі Магдалены. Марыя Магдалена належыла да групы жанчын, якія спадарожнічылі Хрысту ў Яго вандраванні па Палестыне, прыслугваючы Яму са сваёй маёмасці. Вялікоднай раніцай ёй першай аб'явіўся Змёртвыхпаўсталы Езус.
- 23 ліпеня (серада) – свята св. Брыгіды. Святая Брыгіда нарадзілася ў 1303 годзе каля Упсалі. Выхавала 8 дзяцей, у тым ліку і пазнейшую святую Кацярыну. Паля смерці мужа заснавала закон Найсвяцешага Збавіцеля (брыгідкі).
- 25 ліпеня (пятніца) – свята св. Якуба. Святы Якуб, называны Вялікі, сын рыбака заведэя, старэйшы брат Евангеліста Яна. Быў адным з першых вучняў Езуса і разам з Пятром і Янам. Першы сярод Апосталаў праліў кроў за Хрыста. Быў замучаны ў Ерузаліме каля 44 года. З'яўляецца апекуном Іспаніі і Партугаліі, а таксама пілігрымаў.
- 26 ліпеня (субота) – успамін свв. Яўхіма і Ганны, бацькоў НПМ

21 ліпеня – **гадавіна смерці кардынала Казіміра Свёнтка** (2011).

У пятніцу – **благаслаўленне аўтамабіляў і вадзіцеляў** праз заступніцтва св. Крыштафа.

Просьба на гэтым тыдні ў сваіх малітвах далучыць **інтэнцыю аб міры на Украіне.**

Дзякую Вам, дарагія браты і сёстры, за супольную малітву. Няхай Добры Бог узнагародзіць вашую шчодрасць і дабрыню. Добрага перажывання нядзелі і плённых дзён працы.

тэл: **8-029-880-99-19** (*кс. Андрэй*)

**Нядзельнае Евангелле:**

# Мц 13, 24–30



*Пакіньце расці разам тое і другое да жніва*

**+ Чытанне святога Евангелля паводле Мацвея.**

**У той час Езус прапанаваў людзям іншую прыпавесць, кажучы: Валадарства Нябеснае падобнае да чалавека, які пасеяў добрае насенне на полі сваім. Калі ж людзі спалі, прыйшоў вораг яго і пасеяў між пшаніцаю каласоўнік і пайшоў. Калі ж збажына ўзышла і дала плод, тады паказаўся каласоўнік. Прыйшоўшы ж, слугі гаспадара дому сказалі яму: Пане, ці ж не добрае насенне пасеяў ты на полі сваім? Адкуль жа на ім каласоўнік. Ён жа сказаў ім: Вораг зрабіў гэта. А слугі сказалі яму: Хочаш мы пойдзем выпалаць яго? Але ён сказаў: Не, каб, выбіраючы каласоўнік, вы не павырывалі разам з ім і пшаніцы. Пакіньце расці разам тое і другое да жніва; і ў час жніва я скажу жняцам: збярыце спачатку каласоўнік і звяжыце яго ў пучкі, каб спаліць; а пшаніцу збярыце ў гумно маё.**

**Гэта слова Пана.**

*Горш за усё, калі узгаданае пустазелле, каласоўнік так разрастаецца ў нашым жыцці, што мы да яго прывыкаем, больш таго, часам нам можа здавацца, што без яго і жыць немагчыма... Горш за ўсё, калі гэтае пустазелле становіцца для нас важнейшым за зерне Божага слова...*

*Тады мы перастаём быць тымі, хто слухае Пана, мы становімся натоўпам, які няздольны сказаць Хрысту “Так!” на яго заклік “Ідзі за Мной”, але здольны закрычаць “Укражуй Яго!”...*

2014 © **Рымска-каталіцкая парафія Маці Божай Бялыніцкай г. Горкі**